# Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у пастанову Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь ад 10.04.2012 №4 «Аб пераліку мерапрыемстваў у сферы інфарматызацыі»




У адпаведнасці з пастановай № 3 ад 29 лютага 2016 г. Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь зацверджаны пералік мерапрыемстваў у сферы інфарматызацыі ў новай рэдакцыі. У пералік мерапрыемстваў па-ранейшаму ўключаюцца мерапрыемствы па развіцці інфраструктуры электроннага ўрада. Удакладнены мерапрыемствы па распрацоўцы і ўкараненню ў дзейнасць дзяржаўных органаў у мэтах рэалізацыі дзяржаўных функцый у электронным выглядзе інфармацыйных рэсурсаў і інфармацыйных сетак. Так у мерапрыемствы ўключаецца таксама набыццё камп'ютэрнага абсталявання, праграмнага забеспячэння, комплексаў праграмна-тэхнічных сродкаў, правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці, тэлекамунікацыйнага абсталявання, неабходнага для рэалізацыі мерапрыемствы і эксплуатацыі атрыманага выніку ў поўным аб'ёме. Гэта значыць, гаворка ідзе пра неабходныя рэсурсы для рэалізацыі інфармацыйных рэсурсаў і інфармацыйных сетак. Удакладнена выключэнне са складу мерапрыемстваў у сферы інфарматызацыі, звязанае з актуалізацыяй інфармацыйных рэсурсаў. Таксама выключаюцца работы па тэхнічнай падтрымцы і суправаджэнню інфармацыйных сістэм. Павялічаны парогавыя значэння гадавоц патрэбы для закупкі праграмнага забеспячэння, камп'ютэрнага і тэлекамунікацыйнага абсталявання. Аб'ём сродкаў для дзяржзакупкі ў дзяржаўных органах праграмнага забеспячэння замест 300 базавых велічынь (далей - б.в.) павялічылі да 1000 б.в., абсталявання - да 6000 б.в., для іншых арганізацый - 3000 б.в. і 10 000 б.в. адпаведна. Таксама ў сферы дзейнасці дзяржаўных арганізацый да выключэнняў ставіцца рашэнне задачы, звязанай з развіццём дзяржаўнай сістэмы прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, распаўсюджваннем (прадастаўленнем) дзяржаўных інфармацыйна-прававых рэсурсаў.

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/15-04-2016-238*